Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 2. Варыянт 6. Ч.1**

## Білет №2. Практычнае заданне. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь

**Заданні распрацавала:**настаўнік гімназіі № 27 Елісеенка Вольга Аляксандраўна

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1.Да якога часу адносіцца інфармацыя гістарычных крыніц?
2.Аб развіцці якой сферы жыцця грамадства ідзе гаворка ў гістарычных крыніцах?
3.Вызначце задачы і прыярытэты дзяржаўнай палітыкі, указаныя ў дакладзе Прэзідэнта? (крыніца 1)
4.Пацвердзіце статыстычнымі дадзенымі, што сацыяльнаму развіццю надаецца вялікая ўвага?

<u>Крыніца 1.</u>

**З даклада Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на VI Усебеларускім народным сходзе: 11 лютага 2021 г.**
"...Мы зрабілі інтарэсы беларусаў прыярытэтам нашай эканамічнай палітыкі. Сацыяльная дзяржава - гэта наш нязменны нацыянальны брэнд. Прынцып раўнапраўнага размеркавання, раўнамернага размеркавання выгод да нядаўняга часу цалкам падмацоўваўся запытам грамадства на апеку дзяржавы. Гэта логіка закладзена ў аснову такіх важнейшых інстытутаў, як салідарная пенсіённая сістэма, бясплатныя для ўсіх ахова здароўя і адукацыя, падтрымка шматдзетных сем'яў і іншых катэгорый насельніцтва. Дзяржава гатова захаваць сацыяльныя гарантыі і дапоўніць новымі элементамі.

Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што задача дзяржавы - стварыць такія ўмовы ўзаемадзеяння паміж сацыяльнымі групамі, каб яны ўсімі і кожным выхоўваліся і ўспрымаліся як справядлівыя. Менавіта справядлівасць з'яўляецца асновай грамадскай дамовы, або так званага сацыяльнага кантракту, які павінен знайсці адлюстраванне ў Канстытуцыі..."

**Крыніца 2 ( з матэрыялаў Нацыянальнага статыстычнага камітэта РБ)**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі




**Крыніца 3 ( з матэрыялаў Нацыянальнага статыстычнага камітэта РБ)**

**РАСХОДЫ КОНСОЛИДИРОВАННОГО БЮДЖЕТА
НА СОЦИАЛЬНУЮ СФЕРУ**
*(в процентах к ВВП)*

| | 2016 | 2017 | 2018 | 2019 |
|---|---|---|---|---|
| Расходы | 12,5 | 11,9 | 11,7 | 12,2 |
| в том числе на: | | | | |
| образование | 4,8 | 4,6 | 4,6 | 4,9 |
| здравоохранение | 4,2 | 4,1 | 4,0 | 4,2 |
| физическую культуру, спорт, культуру и средства массовой информации | 0,9 | 0,9 | 0,9 | 1,0 |
| социальную политику | 2,6 | 2,3 | 2,1 | 2,2 |